У 2019 годзе спаўняецца 105 гадоў з дня нараджэння Народнага пісьменніка Беларусі **Аркадзя Куляшова**. Выдатны паэт і грамадзянін аставіў нам выдатную літаратурную спадчыну. Яго паэтычнымі радкамі захапляецца ўжо далёка не першае пакаленне беларусаў. Юбілей паэта з'яўляецца яшчэ адной выдатнай нагодай перачытаць яго цудоўныя радкі, нагадаць старонкі выбітнага жыцця і творчасці. Прапануем вашай увазе метадычныя парады па правядзенню юбілейных мерапрыемстваў.

Біяграфічныя звесткі жыцця і творчасці

Аркадзя Аляксандравіча Куляшова

1914 –1978

1914г., 6 лютага – нарадзіўся ў мястэчку Самацэвічы Касцюковіцкага раёна ў сям'і настаўніка

1926 г. – Клімавіцкая раённая газета "Наш працаўнік" надрукавала яго верш на беларускай мове "Ты мой брат"

1928-1931гг. – вучыўся у Мсціслаўскім педтэхнікуме

1930 г. – Белдзяржвыдавецтва выпусціла першы зборнік вершаў А. Куляшова "Росквіт зямлі"

1931-1933гг. – вучыўся на літаратурным факультэце Беларускага вышэйшага педагагічнага інстытута

1933г. – выйшла першая паэма паэта "Аманал"

1941-1943 гг. – служыў у армейскай газеце "Знамя Советов"

1943-1945гг. – служыў у Беларускім штабе партызанскага руху

1945-1946 гг. – рэдактар газеты "Літаратура і мастацтва"

1946г. – за паэму "Сцяг брыгады" прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР

1949г. – за паэму «Новае рэчышча» другі раз прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР

1958-1967гг. – галоўны рэдактар кінастудыі "Беларусьфільм"

1 лістапада 1968г. – Аркадзю Куляшову прысвоена Ганаровае званне Народнага паэта БССР

4 лютага 1978г.– Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў памёр у Несвіжы. Пахаваны ў Мінску на Усходніх могілках.

Аркадзь Куляшоў з'яўляецца аўтарам такіх ***кніг паэзіі***, як «Росквіт зямлі» (1930), «Па песню, па сонца!..», «Медзі дождж» (абодва — 1932), «У зялёнай дуброве» (1940), «Добры чалавек» (1941), «На сотай вярсце» (1945), *«Новая кніга» (1964)*, «Сасна і бяроза» (1970), *«Мая Бесядзь» (1973)*, «Хуткасць» (1976), «Крылы» (1985), «Профілі» (1987), «Маналог» (1989) і інш.

Вялікую вядомасць набылі яго такія ***паэмы***, як «Аманал» (1933), «Хлопцы апошняй вайны» (1940), «Сцяг брыгады» (1943), «Прыгоды цымбал» (1944), «Дом № 24» (1944), «Простыя людзі» (1949), «Грозная пушча» (1958), «Цунамі» (1968), «Далёка да акіяна» (1972), «Варшаўскі шлях» (1973), «Хамуціус» (1975).

Прапануем аформіць

кніжныя выставы і паліцы

пад назвамі:

- "Я – акіяну жытняга калоссе…"
- "І вечнасць радка, як вечнасць жыцця"
- "Мільёны лёсаў у адным"
- "Паэзія – маё жыццё"
- "Край беларускі…мне дарагі і блізкі"
- "Урокі жыцця і творчасці А.Куляшова"
- "Я на ўсё жыццё абраў дарогу"
- "Карусель Аркадзя Куляшова"
- "І кружыцца планета Куляшова…"

Прыклады

масавых мерапрыемстваў,

прысвечаных жыццю і творчасці

народнага паэта Беларусі **Аркадзя Куляшова**

- Літаратурна-мастацкая імпрэза ***“Асуджан я любоўю пажыццёва…”***
- Літаратурны партрэт “***Далёкі і блізкі Аркадзь Куляшоў”.***
- Інтэлектуальная гульня “***Пясняр свайго і вечнага часу***”
- Літаратурна-музычны салон ***“І сэрца абпалена смагай радка”***
- Літаратурна-паэтычная вечарына ***"Ёсць у паэта свой аблог..."***
- Партрэтны нарыс ***“Пясняр свайго і вечнага часу”***
- Паэтычны альманах ***"Ты была маёй любай зямлёю..."***
- Літаратурная віктарына ***“Чарадзей роднага слова”***
- Літаратурна-паэтычны марафон ***“Спакойнага шчасця не зычу нікому…”***
- Паэтычная вітрына ***“Салдат свайго часу”***
- Літаратурнае свята ***“У сэрцы і думках...”***

«Волат беларускай паэзіі»

Макет кніжна-ілюстрацыйнай экспазіцыі

“Мне кожны год, нібы жыццём другім,
Жыць у дваццаты век наш давялося...
Я – акіяну жытняга калоссе:
Мільёны лёсаў змешчаны ў маім,
Яшчэ да дна не вычарпаным, лёсе”.

А. Куляшоў

I раздзел

“**У дарозе няспыннай”**

(*Літаратура аб жыцці і творчасці А. Куляшова*)

“Паўтарыў бы зноў, каб давялося,
Я жыццё сваё – за крокам крок”.

А. Куляшоў

II раздзел

“**І вечнасць радка, як вечнасць жыцця”**

(*творы А. Куляшова*).

“Хачу неспакойнаю хмарай грымець,
Маланкамі ўвесь апавіты.
Каб цяжка адразу было зразумець
Ці вокам акінуць, які ты”.

А. Куляшоў

III раздзел.

“І ёсць адказнасць перад строгім вершам”

(Пераклады А. Куляшова)

“Пераклады А. Куляшова – вялікае багацце беларускай культуры. Мноства шэдэўраў сусветнага значэння, не губляючы сваёй сілы і велічы, перайшлі ва ўлонне беларускага мастацкага слова і пашырылі яго далягляды.” *В. Бечык.*

Інтэлектуальная гульня
“**Пясняр свайго і вечнага часу”,**
прысвечаная жыццю і творчасці Аркадзя Куляшова.

Правілы гульні: *удзельнічаюць дзве каманды. Пытанні раздзелены на 2 блокі. За кожны правільны адказ каманда атрымлівае адзін бал. Балы падлічваюцца пасля кожнага блока пытанняў.*

Блок 1-ы. Біяграфія і творчасць

1. Дзе і калі нарадзіўся паэт? (6 лютага 1914 г. у вёсцы Самацэвічы Касцюковіцкага раёна)

2. Колькі гадоў было А. Куляшову, калі яго першы верш надрукавала газета "Наш працаўнік"? Які гэта быў верш? (верш “Ты мой брат”, А. Куляшову было 12 гадоў)

3. Які верш быў прысвечаны прыгожай дзяўчыне Алесі Карыткінай, які набыў шырокую папулярнасць дзякуючы ансамблю “Песняры”.

(песня “Алеся” на верш “Бывай…”)

4. У якіх навучальных установах вычыўся паэт? (у Самацэвіцкай сямігодцы, Мсціслаўскім педагагічным тэхнікуме, Беларускім вышэйшым педагагічным інстытуце ў Мінску, ваенна-палітычнам вучылішчы пад Ноўгарадам)

5. Колькі гадоў было паэту-пачаткоўцу, калі быў выдадзены яго першы зборнік і як называўся?

(16 гадоў, “Росквіт зямлі”)

6. Які твор рускага паэта зрабіў на Куляшова вялікае ўражанне? (паэма М.Лермантава “Мцыры”)

7. Назавіце жаночае імя, якое часта сустракаецца ў творах паэта? (Алеся)

8. За якую паэму ваенных гадоў А.Куляшову была прысуджана ў 1946 годзе Дзяржаўная прэмія СССР. (“Сцяг брыгады”)

9. Які твор пісьменнік прысвяціў Кастусю Каліноўскаму? (“Хамуціус”)

10. Творы якіх вядомых паэтаў перакладаў А.Куляшоў на беларускую мову? (А. Пушкіна, М. Лермантава, Т. Шаўчэнкі, У. Маякоўскага, А. Твардоўскага, М. Ісакоўскага.)

13. Якімі ордэнамі ўзнагароджаны А.Куляшоў? (Двума ордэнамі Леніна, ордэнам чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага сцяга)

14. У якім годзе паэту прысвоена ганаровае званне народнага паэта БССР? (1968г.)

15. Калі памёр і дзе пахаваны А. Куляшоў? (памёр у лютым 1978 г., пахаваны на Усходніх могілках у г. Мінску)

Блок 2-гі. Аркадзь Куляшоў і мастацтва

Пажадана паставіць аудыязапіс песні “Бывай…” у выкананні гурта “Песняры”.

1. Які беларускі кампазітар напісаў музыку да песні на верш “Бывай…”? (Ігар Лучанок)

2. Які музычны гурт упершыню выканаў песню на верш “Бывай…” і пад якою назваю яе ведаюць слухачы? (выконваюць “Песняры”, песня называецца “Алеся”)

3. Хто быў выканаўцам песні на словы верша “Камсамольскі білет”? (гурт “Песняры”)

4. Якім чынам Аркадзь Куляшоў быў звязаны з кінамастацтвам? (пісаў сцэнарыі для кінастудыі “Беларусфільм”)

5. Сцэнарыі да якіх кінафільмаў напісаў Аркадзь Куляшоў у сааўтарстве з другімі пісьменнікамі? (“Чырвонае лісце” і “Першыя выпрабаванні”)

«Ты была маёй любай зямлёю...»

Сцэнарны план паэтычнага альманаха

Чытальнік:

Я з юнацкіх дзён лічуся вязнем,
Бо зарок з мяне зямля ўзяла —
Я за лёс яе прыкуты ўласным
Ланцугом пакуты да стала.
Я на ўсё жыццё абраў дарогу,
На якой калючак больш, чым руж.
Сэрца — як набат, што б'е трывогу
За мільёны падгарматных душ.
А калі ў смяротным грозным гуле
Упаду я, кінуты на дол
Ранняю хваробай альбо куляй,
І асірачу пісьмовы стол, —
Аб такім не пашкадую лёсе,
Бо, юнацкі помнячы зарок,
Паўтарыў бы зноў, каб давялося,
Я жыццё сваё — за крокам крок.

(Я з юнацкіх дзён лічуся вязнем // Куляшоў, А. Дарогі : вершы, паэмы / Аркадзь Куляшоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. — С.125.)

Вядучы 1: Аркадзь Куляшоў. Народны паэт Беларусі, адзін з таленавітых і папулярных песняроў сучаснасці. Яго творы годна вытрымалі выпрабаванні часам. Аркадзь Куляшоў стварыў выдатныя ўзоры беларускай паэзіі, у якіх з мастацкай паўнатой і пераканаўчасцю выяўлена сутнасць характару беларуса, раскрыты глыбокі сэнс яго жыцця. Паэзія Аркадзя Куляшова шматгранная, якая ўсхвальвае як прыгажосць роднага краю, так і чалавека, адданнага сваёй краіне, свайму народу.

Чытальнік:

Я хаце абавязаны прапіскаю —
Калыскаю, падвешанай пад столь.
Я маці абавязан кожнай рыскаю,
Драўлянай лыжкаю, глінянай міскаю —
Усім, чым працы абавязан стол.
Я — матчын спеў, я — матчыны трывогі,
Я — матчын гнеў, які ўставаў на ногі,
Гнаў смерць на Захад — у нару з нары —
Трацілаваю пугай перамогі.
Дыміліся сямі франтоў дарогі
За мной, як дынамітныя шнуры.
Пазбавіўшы ад грознага відовішча
Свет, не дазволю я, каб дым і пыл
Зямлю ператварыў у бамбасховішча,
Мільярд прапісак — у маўклівы прысак,

Мільярд калысак — у мільярд магіл.

(*Я хаце абавязаны прапіскаю… // Куляшоў, А. Дарогі : вершы, паэмы / Аркадзь Куляшоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. — С.134)*

Вядучы 2: Нарадзіўся Аркадзь 6 лютага 1914 года на Магілеўшчыне ў мястэчку Самацэвічы Касцюковіцкага раёна ў сям'і настаўніка. Дзякуючы гэтаму будучы паэт спасціг грамату ў даволі юным узросце. Ды і яго паэтычны талент абудзіўся даволі рана. У 1926 г. Клімавіцкая раённая газета "Наш працаўнік" надрукавала яго верш "Ты мой брат". Аўтару было ў гэты час дванаццаць гадоў. Праз год было змешчана яшчэ каля дзесяці вершаў у газеце "Магілёўскі селянін", а адзін верш быў надрукаваны нават у рэспубліканскай газеце "Беларуская вёска".

Вядучы 1: У 1928 годзе, калі юнаму паэту было чатырнаццаць гадоў, у часопісе "Полымя" з'явіўся верш "Бывай…". Гэты твор быў народжаны першымі і шчырымі пачуццямі да вельмі прыгожай дзяўчыны – Алесі Карыткінай. Калі яны пазнаёміліся, юнаму паэту было 11 год, Алесі – 13.

Вобраз першага кахання жыў у сэрцы А.Куляшова ўсё жыццё, і таму ён неаднойчы згадваў Алесю ў сваіх паэтычных творах, вяртаўся да раней напісаных радкоў, шліфаваў іх. Значна пазней, у 1972 годзе, верш "Бывай…" стаў цудоўнай песняй "Алеся", якая набыла шырокую папулярнасць дзякуючы музыцы Ігара Лучанка і выкананню яе ансамблем "Песняры".

(*Гучыць музычны твор "Алеся")*

Вядучы 2: У 1928 годзе, пасля заканчэння Самацэвіцкай сямігодкі, Аркадзь працягваў сваю вучобу ў Мсціслаўскім педагагічным тэхнікуме. У гады вучобы творы маладога паэта ўсё часцей і часцей сталі з'яўляцца на старонках рэспубліканскіх газет і часопісаў, а ў 1930 годзе выйшаў у свет першы яго зборнік вершаў "Росквіт зямлі".

Вядучы 1: Важным этапам у жыцці Аркадзя Куляшова была яго вучоба на літаратурным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута. У гэты час ён настойліва і многа пісаў. У 1932 годзе, калі Аркадзю Куляшову было ўсяго васямнаццаць, выходзяць яго новыя зборнікі вершаў "Па песню, па сонца!" і "Медзі дождж".

Вядучы 2: А ў 1933 годзе выйшла першая паэма пісьменніка "Аманал". Але ж самай прыкметнай з'явай у творчасці А. Куляшова даваеннай пары стаў цыкл вершаў "Юнацкі свет". Сюды ўвайшлі такія выдатныя вершы, як "На сотай вярсце", "Карусель", "Бюро даведак", "Воблака" і інш. Аўтар стварыў непаўторны вобраз свайго сучасніка, працавітага, настойлівага, мэтанакіраванага стваральніка жыцця. З цыкла вершаў "Юнацкі свет" пачынаецца сапраўдная творчасць Аркадзя Куляшова. Паэзія яго набывае тыя асноўныя якасна-самабытныя рысы, якія найбольш ярка выявіліся ў яго творах ваеннага часу.

Чытальнік:

З дзеўчынай развітваўся юнак,
Аддаваў яе шляхам, далінам.
- Лепш бы млынам стаць... -
Падумаў так
І зрабіўся на тым месцы млынам.
Людзі жыта носяць дзень у дзень,
А драўляны млын слухмяна меле.

Замест сэрца - б'юцца жорны ў целе,
А замест крыві -
Вады струмень...
Кажа нам паданне пра яго,
Што не можа ён з тых чараў выйсці,
Як не перамеле ўсяго,
Што яму належала калісьці.
Як належала яму не шмат,
Дык спадзе з яго палон драўляны,
Прыйдзе зноў ён вольны да дзяўчат,
Ні ў адну яшчэ не закаханы.
А як шмат?.. Але гадаць не след,
Бо адзін ён ведае пра тое,
Што яму належаў цэлы свет,
Як хадзіў з дзяўчынай у жытное.

(*Млын // Куляшоў, А. Дарогі : вершы, паэмы / Аркадзь Куляшоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. — С.14)*

Вядучы 1: Першыя дні вайны засталі Аркадзя Куляшова ў Мінску, дзе ён сваімі вачыма бачыў варварскі бамбёж горада. Тое, што ўбачыў паэт у першыя дні фашысцкай навалы, уразіла душу сваім трагізмам і нечаканасцю і нашчэнт развеяла яго ранейшыя ўяўленні аб вайне.

Як ад роднай галінкі дубовы лісток адарван,
Родны Мінск я пакінуў,
Нямецкай бамбёжкаю гнаны.
Міма дрэў, міма дрэў
Усю ноч я ішоў, - за спіною
Родны горад гарэў,
І не ведала сэрца спакою.

(Сцяг брыгады)

Вядучы 2: Аркадзь Куляшоў дабравольцам адправіўся на фронт. Яго накіравалі ў ваенна-палітычнае вучылішча пад Ноўгарадам. Адначасова ён стаў працаваць журналістам у армейскай газеце "Знамя Советов". На старонках армейскага друку з'яўляюцца палымяныя вершы паэта: "Ліст з палону", "Балада аб чатырох заложніках", "Над брацкай магілай". А верш *"Камсамольскі білет"* ведаюць многія пакаленні беларусаў. Доўгія гады гэты пранікнёны твор вывучалі ў сярэдняй школе, вучылі яго на памяць. А музычны гурт "Песняры" нават выконваў песню, напісаную на словы верша.

Вядучы 1: Ваенная лірыка Куляшова – шматгранная. У гэты час з-пад яго пяра выходзілі выдатныя ўзоры лірыкапубліцыстычнай паэзіі. Асабліва каштоўнае ў гэтых творах – псіхалагічная глыбіня пачуццяў пра перажытае і выпакутаванае чалавекам ва ўмовах ваеннага ліха.

Вядучы 2: Пад грукат гармат у 1942 годзе Аркадзь Куляшоў напісаў паэму "Сцяг брыгады", вяршыню яго ваеннай творчасці. Гэта быў першы буйны твор аб Вялікай Айчыннай вайне не толькі ў беларускай, але і ва ўсёй савецкай літаратуры. Паэма

захапляла суровай праўдай вайны, лірычнасцю, сардэчнасцю і паэтычным майстэрствам. У 1946 годзе за паэму “Сцяг брыгады” паэту была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР.

Чытальнік:

Стаіць яна ў срэбнай кашулі
Адна на пагосце.
Варожыя кулі
Пакінулі след на бяросце.
Стралялі чужынцы, ды цудам бярозка ўцалела.
Стаіць яна, нібы дзяўчына на месцы расстрэла.
Не плач жа, бярозка, не лі свае слёзы,
Красуня,
Над люстрам ракі запляці свае косы,
Красуня.
Цябе не застрэлілі і не пагналі ў няволю.
Расці ж ты на радасць і рэчцы, і людзям, і полю!

(Бярозка // *Куляшоў, А. Дарогі : вершы, паэмы / Аркадзь Куляшоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. — С.38)*

Вядучы 1: Ад празрыстых, бясхітрасных, але далёка не прымітыўных ранніх вершаў да сапраўдных паэтычных шэдэўраў – такі шлях творчай дзейнасці Куляшова. У ягоных творах крытыкі знаходзяць сляды ўплыву Купалы і Лермантава, і яго вялікага сябра – Аляксандра Твардоўскага. Але Аркадзь Куляшоў заўсёды быў і застанецца паэтам самабытным, нечаканым і глыбока народным. Жыццё беларускага народа, народная мудрасць – невычэрпная крыніца яго паэзіі.

Вядучы 2: Пасля ваЙны выходзілі з друку новыя кнігі паэта. За паэму “Новае рэчышча” Аркадзю Куляшову ў 1949 годзе ў другі раз была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР. А зборнік паэзіі “Новая кніга” паклаў пачатак новаму этапу яго творчасці. Радкамі сваіх твораў паэт вядзе шчырую, усхваляваную размову з ХХ-м стагоддзем.

Чытальнік:

Я з юнацкіх дзён лічуся вязнем,
Бо зарок з мяне зямля ўзяла —
Я за лёс яе прыкуты ўласным
Ланцугом пакуты да стала.
Я на ўсё жыццё абраў дарогу,
На якой калючак больш, чым руж.
Сэрца — як набат, што б'е трывогу
За мільёны падгарматных душ.
А калі ў смяротным грозным гуле
Упаду я, кінуты на дол
Ранняю хваробай альбо куляй,
І асірачу пісьмовы стол, —
Аб такім не пашкадую лёсе,

Бо, юнацкі помнячы зарок,
Паўтарыў бы зноў, каб давялося,
Я жыццё сваё — за крокам крок.

(Я з юнацкіх дзён лічуся вязнем…// Куляшоў, А. Дарогі : вершы, паэмы / Аркадзь Куляшоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. — С.125)

Вядучы 1: Аркадзь Куляшоў надаў высокі філасофскі ўзровень беларускай паэзіі. Паэт не ўсведамляў сябе па-за агульназначнымі праблемамі чалавечага быцця. Ён раскрываў агульначалавечае праз глыбока асабістае ўспрыманне рэчаіснасці і свету наогул. Пісьменнік узбагаціў традыцыі беларускага верша, пашырыў яго вобразна-выяўленчыя і стылёвыя магчымасці.

Вядучы 2: 4 лютага 1978 года Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў заўчасна памёр у Несвіжы, знаходзячыся на адпачынку. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

За выдатную творчую літаратурную працу Аркадзь Куляшоў быў узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага сцяга і многімі медалямі.

Вядучы 1: Імя Аркадзя Куляшова прысвоена Магілёўскаму педагагічнаму ўніверсітэту, сярэднім школам у Мінску і Самацэвічах, вуліцам у Мінску і Касцюковічах. На доме, у якім ён жыў, усталявана мемарыяльная дошка. З 1979 года ў Беларусі аўтарам лепшых мастацкіх твораў прысуджаецца літаратурная прэмія імя Аркадзя Куляшова.

Чытальнік:

Ёсць у паэта свой аблог цалінны,
Некрануты прастор для баразён,
дзе ён працуе з першае хвіліны
і да апошніх вечаровых дзён;
Ёсць думак прагавітае насенне,
У жменю назбіранае з дарог,
Што спелага чакае ўвасаблення,
Заліўшы хваляй жытняю аблог;
Ёсць сэрца маладое, без якога –
Без палкага, жывога пачуцця –
Няма ў яго нічога: ні аблога,
Ні плённых дум, ні самаго жыцця.

(Ёсць у паэта свой аблог цалінны // Куляшоў, А. Паміж наступным і былым : вершы, паэмы / Аркадзь Куляшоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1995. — С.121)

Спіс выкарыстанай і рэкамендаванай літаратуры

Творы пісьменніка:

1. Куляшоў, А. Дарогі : вершы, паэмы / Аркадзь Куляшоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. — 318 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

2. Куляшоў, А. Паміж наступным і былым : вершы, паэмы / Аркадзь Куляшоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1995. — 542 с. : іл. — (Бібліятэка беларускай класікі).

Аб жыцці і творчасці А. Куляшова:

3. Міцкевіч, У. А. Аркадзь Куляшоў у школе : дапаможнік для настаўніка / У. А. Міцкевіч. — Мінск : Народная асвета, 1979. — 80 с., [4 л. іл.].

4. Бярозкін, Р. Аркадзь Куляшоў : нарыс жыцця і творчасці / Р. Бярозкін. — Мінск : Народная асвета, 1978. — 192с., [4л. іл.]. — (Народныя паэты БССР).

Артыкулы з перыядычных выданняў:

5. Ярац, А. Балючая балада : да стагоддзя з дня нараджэння Аркадзя Куляшова / Алег Ярац, Віктар Ярац // Роднае слова. — 2014. — № 2. — С. 3— 5.

6. Сукора, Л. Біяграфія і творчасць Аркадзя Куляшова : тэст (10 клас) / Людміла Сукора // Роднае слова. — 2014. — № 2. — С. 62—64.

7. Сукора, Л. "Ёсць у паэта свой аблог цалінны..." : інтэлектуальная гульня, прысвечаная жыццю і творчасці Аркадзя Куляшова (11 клас) / Людміла Сукора // Роднае слова. — 2014. — № 2. — С. 72— 74.

8. Бароўская, І. А. "Парушыўшы законы прыцягнення..." : песенна-паэтычная спадчына Аркадзя Куляшова / Ірына Бароўская // Роднае слова. — 2014. — № 2. — С. 82—84.

9. Дзямідава, Л. "Ёсць у паэта свой аблог..." : літаратурна-паэтычная вечарына да 100-годдзя з дня нараджэння Аркадзя Куляшова / Л. Дзямідава // Бібліятэка прапануе. — 2013. — № 11. — С. 13— 16.

Электронныя рэсурсы:

І вечнасць радка, як вечнасць жыцця - метадычныя рэкамендацыі па прапагандзе творчасці Аркадзя Куляшова (2013) // ГУК ЦБС Быховского района [Электронный ресурс] : Методические рекомендации. — Режим доступа: https://onedrive.live.com/view.aspx?resid=2F712D8EE7AA4A02!4216&ithint=file%2cdocx&app=Word&authkey=!AAqkmxl0wPdlFJU .

— Дата доступа: 23.01.2019.

Аб любві
Да нябёс уздымае зямля
Каласы сваіх ніў,
Каб сагрэла іх сонца,
Каб вецер іх там апыліў.

Я не знаю, калі
Палюбілася сонцу зямля,
А зямлі палюбілася сонца, -
Не ведаю я...

Толькі знаю - не меней
Налічвае год іх любоў,
Чымся сонца праменняў,
Зямля - залатых каласоў.

Маладая зямля,
Як нявеста, а сонца - жаніх.
Лета - час іх абдымкаў,
А восень - час ростані іх.

Час чаканняў - зіма,
А вясна - час чаканых сустрэч,
Час шчаслівай любві:
Слёзы - прэч, крыўды - прэч, хмары - прэч.

1950

Аркадзь Куляшоў: Час чытаць, захапляцца і спрачацца : метадычныя матэрыялы да 105-годдзя з дня нараджэння Аркадзя Куляшова / ДУК «Пінская гарадская ЦБС» ; аддзел бібліятэчнага маркетынга ; складальнік Ж. А. Лемяшэўская. – Пинск, 2019г. – 13с.